ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

Орган Косаўскага РК КП(б) Беларусі
і Выканкома Райсовета дэпутатаў працоўных.

№ 17 Серада 13 снежня 1944 г.

**ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ І СОВЕЦКІ НАРОД ГАТОВЫ НАНЕСЦІ НОВЫЯ ЗНІШЧАЛЬНЫЯ УДАРЫ ПА ВОРАГУ. ДНІ ГІТЛЕРАЎСКАГА КРЫВАВАГА РЭЖЫМУ ЗЛІЧАНЫ.**

**(І. СТАЛІН).**

## БОЛЬШ УВАГІ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ Ў ВЁСЦЫ

Гераізм Чырвонай Арміі на фронце і самаадданая праца нашых людзей у тылу, якія маюць сваёй крыніцай гарачы і жыватворны совецкі патрыятызм, арганізатарская дзейнасць большэвіцкай партыі і геній вялікага Сталіна ўвянчалі працяглую і цяжкую барацьбу совецкага народа з гітлераўскай Германіяй гістарычнай перамогай: совецкая зямля ачышчана ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У агульныя намаганні совецкага народа, накіраваныя на канчатковую военную і эканамічную перамогу над ворагам, укладзена самаадданая праца людзей вызваленых раёнаў Беларусі.

Працоўныя нашага раёна многае зрабілі ў абласці аднаўлення разбуранай народнай гаспадаркі і аказання дапамогі наступаючай Чырвонай Арміі. У гэтым сказалася вялікая арганізацыйная і палітычная работа, праведзеная на сяле нашымі партыйнымі, совецкімі і комсамольскімі арганізацыямі.

Аднак у сваёй паўсядзённай рабоце сярод вясковага насельніцтва мы маем рад істотных недахопаў. Многія кіраўнікі сельсоветаў і актывісты не павышаюць па-сапраўднаму свой палітычны ўзровень, не вучацца, адсюль і арганізацыйны бок іх дзейнасці не пастаўлен на належную вышыню. Вясковыя хаты чытальні не сталі яшчэ цэнтрамі палітыка-выхаваўчай і культурна-асветнай работы на сяле.

У абласці ідэалагічнай работы на вёсцы самай галоўнай нашай задачай з'яўляецца арганізацыя глыбокага вывучэння ўсімі сялянамі даклада тав. Сталіна аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі. У гэтай рабоце асноўную роль павінны адыграць сельскія комсамольскія арганізацыі і вясковы актыў. Адначасова трэба павысіць патрабавальнасць да кіраўнікоў сельсоветаў і вясковых актывістаў, сярод якіх, на жаль, ёсць людзі, якія не вучацца самі і не нясуць словы большэвіцкай праўды ў масы.

Даклад тав. Сталіна абавязвае нас крытычна асмысліць сваю дзейнасць, да канца ўскрыць усе недахопы ў рабоце, каб як можна лепш выканаць гістарычныя задачы, пастаўленыя перад совецкім народам нашым любімым правадыром і настаўнікам.

## Вывучаюць даклад правадыра

Актыў пасялковага совета Івацэвічы глыбока вывучае даклад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі.

Кожныя заняткі праходзяць арганізавана і змястоўна. На занятkі прыходзіць многа сялян пасёлка.

Для правядзення дакладаў і гутарак па таму або іншаму раздзелу даклада т. Сталіна запрашаюцца палітработнікі вайсковых часцей і чыгункі.

## За большую прадукцыйнасць працы на нарыхтоўцы і вывазцы лесаматэрыялаў

Адным з важнейшых мерапрыемстваў у раёне зараз з'яўляецца нарыхтоўка і вывазка лесу. Важнасць своечасовага выканання гэтага мерапрыемства дыктуецца ўмовамі бурнага аднаўлення нашых гарадоў, фабрык і заводаў, разбураных нямецкімі нягоднікамі. Акрамя гэтага мы павінны забяспечыць нашы чыгункі неабходнай колькасцю дроў і шпальніка.

Працоўныя нашага раёна добра папрацавалі на нарыхтоўцы лесаматэрыялаў.

З 5 па 10 снежня пяцідзённы графік на нарыхтоўцы лесаматэрыялаў выканан леспрамгасам на 150 проц. З іх па шпальніку на 410 проц., па дровах — на 88 проц.

Уперадзе ідзе Косаўскі лесаўчастак. Тут план 4-га квартала па нарыхтоўцы лесаматэрыялаў выканан на 79 проц.

У той час, як з нарыхтоўкай лесаматэрыялаў мы спраўляемся, затое значна адстаём з вывазкай. Гэтаму пытанню трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу, арганізуючы масавы выезд усіх сялян на лесавывазкі.

Даць краіне неабходную колькасць будаўнічага лесаматэрыялу і дроў — пачотны абавязак кожнага лесаруба і возчыка. Мы павінны, як ніколі, павысіць прадукцыйнасць працы на лесанарыхтоўках і асабліва на лесавывазцы і дабіцца рэгулярнага выканання графіка работ.

Харашчанскі, тэхнарук Косаўскага леспрамгаса.

## ПІСЬМО З ФРОНТУ

У перыяд нямецкай акупацыі Данілкевіч Васіль Міхайлавіч змагаўся супроць нямецкіх захопнікаў у радах Чырвоных партызан. Зараз ён на фронце працягвае граміць нямчуру.

Васіль Міхайлавіч часта піша бацькам. У сваіх пісьмах ён заклікае іх працаваць не пакладаючы рук для хутчэйшага разгрома ворага. Вось адно з яго пісем:

,,Дарагія радзіцелі! Вы пішаце, што ў рабоце многа цяжкасцей. Інакш яно і не можа быць. Чацверты год наша краіна вядзе суровую, кровепралітную вайну супроць нямецкіх захопнікаў, трымае фронт у некалькі тысяч кілометраў. Усё гэта патрабуе вялікага напружання арміі і ўсяго совецкага народа. Пагэтаму, вам у тылу трэба працаваць яшчэ лепш, каб унесці чым большую долю ў нашу агульную справу перамогі над ворагам.

Нам на фронце таксама нялёгка. Бесперапынныя пераходы ў любую пагоду, часта пад агнём праціўніка, сон дзе папала — у падвале, пад кустом, або ў наспех вырытым акопе, суровыя баі з ворагам — вось кароткае паняцце аб нашым франтавым жыцці.

Але свядомасць таго, што ўсё гэта для Радзімы, для хутчэйшага разгрома ненавіснага ворага, дае нам сілы і незгасаемую энергію для новых і новых баёў.

Вораг адступае. Шлях адступлення фашысцкага звера асвятлён заравам пажараў. Але гэта палаюць не нашы родныя беларускія і ўкраінскія сёлы і гарады. Гэта палае ненавіснае фашысцкае логава, куды ўпаўзае ранены фашысцкі звер.

Мы, воіны Чырвонай Арміі, зробім усё для хутчэйшай нашай перамогі. Дапамагайце нам усімі сіламі.

Ваш сын Васіль Данілкевіч''

## ЗАКОНЧЫЛІ ВЫВУЧЭННЕ ДАКЛАДА Т. СТАЛІНА

Як толькі быў апублікован даклад т. Сталіна рабочыя і служачыя станцыі Івацэвічы аб'едналіся ў гуртох па вывучэнню гэтага гістарычнага дакумента. Кіраўніцтва гуртком узяў на сябе начальнік станцыі комуніст т. Саламаха.

Усяго па вывучэнню даклада правадыра праведзена 4 занятак. Заняткі праводзіліся ў выглядзе гутарак і невялікіх дакладаў па таму або іншаму раздзелу, пасля чаго выступаючыя таварышы дапаўнялі ўпушчанае. Заняткі праходзілі ажыўлена і цікава.

Зараз гурток прыступіў да вывучэння кнігі т. Сталіна ,,Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза''.

Ал. Каліна.

## Пушчан у ход вадзяны млын

Пасля напружанай аднаўленчай работы пушчан у ход бусяжскі вадзяны млын. Яго вытворчая магутнасць звыш 3-х тон памолу ў 10 гадзін. Якасць памолу выдатная.

Чалоўскі, тэхнарук Райпромкамбіната.

## Николаю Гойшику

Мы знаем: слов сильней—дела,
Но слово рядом с делом—сила,
И если Родина — звала,
То смерть героя не скосила.

Ему шеснадцать лет всего,
Он, может, не увидит больших...
И в ночь, на подвиг боевой
Шел партизаном Коля Гойшик.

Он сам заверил комсомол,
Что путь закрыт для эшелона,
Когда рвануть промедлил тол,
Поднялось слова непреклонно.

Нет, смерть — герою не удел,
Всегда живой, он с нами снова,
Он показал величьем дел,
Как комсомолец держит слово.

Г. Трифонов.

(,,Комсомольская правда в Белоруссии).

## ЛЕСАЗАВОД АДНАЎЛЯЕЦЦА

За перыяд акупацыі немцы поўнасцю разрушылі ўсе прамысловыя прадпрыемствы на тэрыторыі раёна. Асабліва цяжкае разбурэнне было нанесена Івацэвіцкаму лесазаводу.

З вызваленнем раёна ад нямецкай погані, калектыў рабочых і служачых зразу-ж прыняўся за аднаўленне завода. На сёнешні дзень на заводзе адноўлен лакамабіль у 120 конскіх сіл, адбудован лесапільны корпус, пушчана адна лесарама.

На аднаўленні завода выдатна працавалі брыгады механічнага і будаўнічага цэхаў. Стаханаўцы і ініцыятары аднаўлення т.т. Верстак, Іванюк, Рахавецкі Нікалай, Алізарчык Павел і другія паказалі выдатныя прыклады добрасумленнай і самааддапай працы.

У соцыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшае і канчатковае аднаўленне завода ўключыліся ўсе рабочыя і інжынерна-тэхнічны персанал. Яны ўзялі на сябе абавязацельства да 31 снежня поўнасцю пусціць лесацэх на ўсю яго магутнасць.

В. Внук, дырэктар лесазавода.

Рэдактар А. П. РУДОЙ.

## Аб'ява

Косаўскае РА НКВД даводзіць да ведама, што грамадзяне гор. Косава, атрымаўшыя пашпарты павінны прапісацца па месцу жыхарства ў пашпартным стале не пазней як праз 24 гадзіны з часу атрымання пашпарта. Пры прапісцы трэба прадставіць дамавую кнігу.

Грамадзяне, якія не прайшлі прапіску будуць падвяргацца штрафу.

Прапіска праводзіцца штодзённа з 10 до 16 гадзін.

Пры прапісцы абавязкова прад'яўляецца пашпарт.

РА НКВД.

Адрас рэдакцыі: Косаў, вул. Максіма Горкага, 106